№8 (34)

Беларуская маладзёжная

Рэспубліканская грамадска-палітычная незалежная газета • Заснавана ў чэрвені 1994 г.



Дмитрий ЖУКОВ:

Отношения Беларуси и России в свете харизм главных фигур

(стр. 2)

TV программа на неделю

(стр. 4)

Пра РОК

(стар. 7)

Згуртаванне вайскоўцаў зноў зарэгістравана

Міністэрства юстыцыі пасля трох з паловай месяцаў разгляду, што нават перавышае ўстаноўлены законам тэрмін, нарэшце зарэгістравала патрыятычны рух "Беларускае згуртаванне вайскоўцаў". Выканаўчая рада БЗВ прыняла з гэтай нагоды заяву, у якой гаворыцца, што пазбаўленне БЗВ юрыдычнай рэгістрацыі ў студзені 1994 года рэжымам Кебіча не перапыніла нашай дзейнасці на карысць Бацькаўшчыны.

З моманту скасавання юрыдычнай рэгістрацыі колькасць раённых арганізацый БЗВ узрасла ўдвая. Незарэгістраванае, але рэальна існуючае БЗВ правяло шэраг масавых акцый, накіраваных на гісторыка-патрыятычнае выхаванне моладзі і грамадства.

З мэтай дамагчыся сумленных прэзідэнцкіх выбараў БЗВ ініцыіравала і арганізавала працу Грамадскай кантрольнай камісіі, у якой дзеля права народа на свабодны выбар аб'ядналі свае намаганні асноўныя грамадскія арганізацыі і ўсе рэальныя прэтэндэнты на пасаду прэзідэнта, акрамя Кебіча і камуністаў. Ва ўсіх буйных гарадах Беларусі сфарміраваліся дружыны рэгіянальнай аховы і бяспекі ("драбы" БЗВ), мэта якіх -- барацьба супраць злачыннасці і падрыхтоўка мужчын для выканання свайго канстытуцыйнага абавязку -- абароны незалежнасці нашай краіны.

Далей у заяве гаворыцца: "Мы памятаем імёны 70 дэпутатаў Вярхоўнага Савета, па лжываму даносу якіх наш рух быў пазбаўлены рэгістрацыі. Мы і надалей, з рэгістрацыяй ці без яе, будзем працягваць і пашыраць сваю працу -- каб у беларусаў быў свой дом, свая дзяржава, каб у ім добра жылося кожнаму і каб у гэтым доме быў парадак".

Мікола АХРЫМУК

• Находки дипротокола

В РОССИЮ ПРОСЯТСЯ НАЗАД, А БОРЕ... МИЛИЦЕЙСКИЙ ЗАД?

(стр. 2)

Нашай дзяржаве жыццёва неабходна паўнапраўная і моцная чацвёртая ўлада!

Заява журналістаў -- удзельнікаў Нацыянальнай асамблеі прагрэсіўных сіл Рэспублікі Беларусь

(стар. 3)

Малашка ведае, як зрабіць нас заможнымі

(стар. 3)

24-26 лютага ў канферэнц-зале гасцініцы "Юбілейная" Беларускі рэспубліканскі Фонд падтрымкі дэмакратычных рэформ імя Льва Сапегі і Беларускі фонд Сораса праводзяць міжнародную канферэнцыю "Дэцэнтралізацыя і лакальная дэмакратыя ў краінах Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. У гэтым форуме прымаюць удзел дэпутаты Вярхоўнага Савета і мясцовых Саветаў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і навуковых устаноў Албаніі, Балгарыі, Венгрыі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Славакіі, Славеніі, Расіі, Румыніі, Украіны, Эстоніі, Чэхіі і Беларусі, прадстаўнікі міжнародных арганізацый Рады Еўропы, HABITAT, СБСЕ. Запрашаем! Тэлефон для даведак: 34-37-91.

Улады супраць металу. Беларускага

(стар. 7)

Нас з вантробамі прадалі Ці вантробы кінуць нам?

Отношения Беларуси и России в свете харизм главных фигур

Отношения с Россией стали почти у всех политиков притчей во языцех. Причем редкие из них не пытаются учить, как эти отношения строить. Попытаюсь и я внести свою лепту в столь важное дело, рассуждая одновременно и как политически ангажированный человек (в 1990 году в результате многотуровых выборов удалось быть избранным на XXYIII съезд КПСС, где я был единственным из всех белорусских делегатов членом "Демократической платформы"), и как человек, от политики далекий (после вступления в ОДПБ года четыре я посвятил завершению работы над диссертацией).

Еще в 1990 году на съезде меня удивила политическая провинциальность большинства белорусских делегатов, без борьбы подчинившихся многочисленной и уверенной в своем превосходстве российской группе. Думаю, и нынче в отношениях Беларуси и России превалируют принципы незабвенного демократического централизма. Коммунизм как проявление общественного сознания никуда не исчез, а его порождение -- большевизм -- взят на вооружение псевдодемократическими руководителями России и Беларуси. К первым из них отношу, конечно же, Б.Н.Ельцина образца 1994-1995 гг. и А.Г.Лукашенко. Большевизм в моем понимании -- это вопиющая беспринципность в достижении политических целей и наплевательское отношение к правам человека в широком смысле и отдельного человека, не защищенного вооруженной охраной, бессильного перед государственной машиной -- в узком.



Б.Ельцин своими действиями в Чечне ярко продемонстрировал живучесть и сущность большевизма: бей своих, чтобы чужие боялись. И мы боимся. "Младший брат" из Беларуси, не обращая внимания на ее Конституцию, не хочет, чтобы такие же граждане, как он, получали из газет информацию о свершившемся факте --докладе депутата Антончика. Этого следовало ожидать. Еще в "Тезисах программы кандидата в президенты Республики Беларусь А.Лукашенко "Отвести народ от пропасти" будущий президент обещал обеспечить "реальную возможность каждому гражданину Республики Беларусь ДУМАТЬ (выделено автором)... на том языке, на котором он воспитан". Выходит, если я вознамерился бы думать на китайском языке, а не на русском, "на котором воспитан", то поддержки кандидата в президенты в своих делах не получил бы. А депутат Антончик, видимо, составляя свой доклад, думал на хинди, потому и не получил высочайшего соизволения опубликоваться.

Итак, по логике нынешнего Ельцина, можно ликвидировать схоронившегося в многоквартирном доме вооруженного бандита уничтожением всего дома вместе с мирными жильцами, а по логике Лукашенко сегодня надо забывать то, что говорилось вчера (рекомендую перечитать уже упомянутые "Тезисы программы..."). Ну, и что полезного для законопослушных граждан может предложить эта непредсказуемая пара? Скорее всего, в соответствии с жесткими правилами большевистской иерархии, А.Г.Лукашенко должен в конечном итоге дать Б.Н.Ельцину все то, что тот пожелает. Но разве от тех или иных желаний капризных руководителей, даже всенародно избранных, должны зависеть белорусско-российские отношения? Сколько уж было встреч на высоком уровне, а результатов (настоящих, а не придуманных советниками) нет. Кстати, об одном из советников. Сергей Посохов, советник президента Беларуси, корреспонденту "Интерфакса" весьма "корректно" сообщил, что на местах к своим кандидатам в депутаты "народ отнесется с большим доверием, чем к тем, кто приезжает из Минска и вешает на уши людям "лапшу" о балтийско-черноморском нефтяном коллекторе". Вот так "мягко" советник выразил свое видение российско-белорусских отношений: нефть в Беларусь -- только из России, а альтернативные варианты -- на помойку. Подскажу советнику Посохову изящную формулировку для использования президентом: "У народа еще "лапша" от прошлых предвыборных обещаний на ушах осталась, а тут новые выборы. Я народ в обиду не дам. Нам такие выборы не нужны. Есть президент -- он всему гарант!"

На мой взгляд, главные принципы безусловно необходимых дружественных отношений между Беларусью и Россией таковы.

Отношения должны быть равноправными (необходимо практически обеспечить политическое равновесие соответствующих должностных лиц, органов и служб двух республик без спекулятивных ссылок на количество жителей и площади территорий). Отношения должны быть взаимовыгодными главным образом с экономической точки зрения (начало доказательства от противного: я одолжил у своего лучшего друга очень много денег до ближайшего четверга, а отдал лишь часть денег в четверг, но через год...).

И Беларусь, и Россия должны стремиться к демократии, которой на наших землях пока не видно, ставя во главу угла приоритет прав человека над интересами державы. При этом в случае серьезных нарушений этого принципа до решения проблем стороны должны воздерживаться от контактов друг с другом в виде рекламных встреч на высшем уровне. В конце концов в демократических государствах правительства создаются для защиты тех свобод, которыми каждый человек обладает благодаря самому факту своего существования (начало доказательства от противного: мы трое знаем друг друга, я борец за справедливость, второй набил третьему морду ни за что -- кулаки чесались; я, зная об этом, устроил со вторым дружескую пирушку...).

Спрашивается, как найти людей, которые смогут реализовать эти принципы? Путем свободных выборов в сроки, определенные Конституцией. Вполне естественно, что многим выборы представляются бесполезными мероприятиями. Но иного не дано, если мы не хотим жить в тоталитарном государстве. Демократические процедуры отрабатываются не сразу, просто избиратели становятся ответственным, умным и придирчивым электоратом не в одночасье. Но коль есть у людей нежелание идти на выборы, то у власть предержащих исчезает охота переизбираться и возникает искушение править диктаторскими методами. Так что -- все на выборы! Для начала -- в Верховный Совет Республики Беларусь.

Дмитрий ЖУКОВ, старший преподаватель БГПА

● НАХОДКИ ДИППРОТОКОЛА

В РОССИЮ ПРОСЯТСЯ НАЗАД, А БОРЕ ... МИЛИЦЕЙСКИЙ ЗАД?

Эрцгерцога Фердинанда в Сараево ухлопал студент по фамилии Принцип. А имя ему было Гавриил. И большая с того началась буча. До сих пор никак не разберутся.

Кому из принимавших Бориса Николаевича вспомнились исторические уроки? Кто просчитал, что Гавриилов и студентов в Минске -- пруд пруди, и парочка-другая принципиальных граждан всегда найдется?

И посему вместо застойно "восторженных" заводчан и студентов выстроены были вдоль всех проспектов через каждые пятьдесят шагов белорусские центрионы.

Не знаю, какой умник нарядил мирно зимующих блюстителей порядка в камуфляжные почему-то куртки, но на февральском снегу они смотрелись как увядающие листики могучего милицейского дуба.. Сам вперед Бориса Николаевича по пр.Машерова проезжал -- убедился. И стояли они по обе стороны проспекта (без кос, правда, но с резиновыми дубинками) к проезжающим ... задом. Бдили. Чтобы из нас кто-нибудь, упаси Бог, из гранатомета в ожидаемый кортеж не пульнул.

Добрых пара тысяч бдили. Я даже не ожидал, что их так много.

Короче говоря, впечатление было не как от вожделенной рублевой, а как от самой заурядной зоны.

Ближе к обеду движение в центре вообще перекрыли. Народ даже из метро не выпускали. А посему многие на работу поопаздывали.

Никто, конечно же, в президентов стрелять не стал. Но шороху милиционеры наделали.

...Никсона вживую видел. Шушкевич с Клинтоном мимо меня по улице проезжали. Даже террориста Арафата в Брестской крепости встречал. А Зенона -- того через день на выходе из метро на Немиге вижу. Но такого, простите, дурдома с охраной ни я, ни весь Минск не видывал!

Н. КОПЧЕНОВ, "БМ"

Маўчым, брат?

Не ведаю, якія высновы зробяць з дзіўнага заціша падчас візіту Барыса Ельцына вядомыя палітычныя аглядальнікі, але мне яно падалося вельмі паказальным. І справа не ў кардонах міліцыянтаў, якія, як звычайна, выстраіліся ўздоўж праспектаў, калі высокі і легендарны госць ускладаў кветкі да помніка Перамогі.

Журналісты напярэдадні прэс-канферэнцыі з'едліва гадалі: адбудзецца яна ці не, з Ельцыным ці без, прычым большасць жартавала -- пасля сустрэчы тэт-а-тэт з нашым прэзідэнтам расейскі не стане (не ў стане) з кімсці сустракацца. Перад сустрэчай Ельцына з навукоўцамі аховы старанна высвятляла асобы гэтых самых навукоўцаў, а народ рабіў тое ж самае, што ён робіць у фінале драмы "Барыс Гадуноў".

Нягледзячы на чуткі аб плануючымся пікеце на плошчы Незалежнасці, абвешчаным беларускімі нацыяналістамі (да якога збіраліся далучыцца ўсе, каму ёсць што сказаць маскоўскаму госцю), з'явіўся там адзін чокнуты хлопчык з плакатам "Кат Ельцын -- вон з Беларусі!", і два дзядзькі збіраліся разгарнуць плакат " Не -- бойні ў Чачні", але так і не разгарнулі. Голас народу можна было пачуць толькі ў аўтобусах і тралейбусах, якія былі загнаныя ў вуліцы ля цэнтру і гадзінамі там стаялі, не выпускаючы людзей -- гэткая "забастоўка" зверху. Вядома, ад тых, з кім цiснулася ў траспарце, нічога дыпламатычнага" наконт "гістарычнай падзеі" не пачула.

Становішча акрэслена: ні адна партыя ці рух не палічылі неабходным аперацыйна і галосна рэагаваць на візіт лідэра краіны, да якой "малодшаму брату" не атрымліваецца пакуль ставіцца абыякава. І не дзіва: у Расіі набіраюць моц зусім іншыя сілы, напрыклад, Рускае Нацыянальнае Адзінства, -- дастаткова на тыдзень з"ездзіць у Маскву, каб у тым пераканацца.

Але не трэба бачыць галодную стомленасць народу ў нулявой рэакцыі на прыезд Ельцына. Многія лічаць, што на гэтую асобу ўжо не мае сэнсу звяртаць увагі, бо камяні пакаціліся і без яе. Ёсць нешта жуткаватае ў тым спакоі, з якім людзі ставяцца да ўласнага прэзідэнта, да ўсіх астатніх, бо за прыцемлівасцю, спакоем і злосна-ціхімі тварамі звычайна ідзе непрадказальнасць народных эмоцый, у тым ліку і ў адносінах да тых, хто па-ранейшаму збіраецца слухацца барына, хучэй падобнага на "генерала, якога няма".

Так, сталіца сустрэла Ельцына маўчаннем. Ён не можа гэтага не адчуць, таму і пазбягаў публічных жэстаў. Што ж, успомнім славутае: "нешта носіцца ў паветры". Пытанне -- што?

Ціна КЛЫКОЎСКАЯ, "БМ"

Грамада ідзе да выбараў

18 лютага 1995 г. у Мінску адбылася першая сесія III з'езда Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады. На з'ездзе прысутнічалі сацыял-дэмакраты Польшчы, Расіі і Латвіі. Прагучалі выступы старшыні партыі БНФ сп.Пазьняка, лідэра АДПБ сп.Дабравольскага, старшыні БЗВ сп.Статкевіча, кіраўнікоў СПБ сп.Карагіна і БЗП сп.Люцко і іншых гасцей з'езда. Удзельнікі з'езда ўнеслі некаторыя змены ў праграму Грамады, прынялі новую рэдакцыю Статута партыі, ухвалілі тэзісы эканамічнай перадвыбарчай праграмы БСДГ, абралі новы склад кіруючага органа партыі -- Цэнтральнай Рады і Кантрольна-рэвізійнай камісіі. Паўнамоцтвы старшыні Цэнтральнай рады партыі дэпутата Вярхоўнага Савета Алега Трусава і яго намеснікаў былі аднагалосна прадоўжаны да сканчэння выбараў у Вярхоўны Савет. Другая сесія III з'езда БСДГ адбудзецца праз месяц -- 18 сакавіка 1995 года. Яе галоўная мэта -- вылучэнне кандыдатаў ад БСДГ у склад новага Вярхоўнага Савета Беларусі.

Прэс-цэнтр Грамады

Всебелорусский клуб избирателей

Редакция клецкой районной газеты "Да новых перамог" провела "круглый стол" на тему "Какое общество мы строим, в таком обществе вы хотели жить". За "круглым столом" встретились представители ОДПБ, ПКБ, Всебелорусского клуба избирателей, Польского демократического объединения, ветеранской организации, профсоюзов района. В основном дискуссия велась о том, кого хотели бы видеть присутствующие в выборных органах власти. По общему мнению, это должны быть специалисты-профессионалы: экономисты, юристы, политики, общественные деятели.

Семинар в IBB

21 февраля в Минском Международном образовательном центре начал работу семинар "Выборы в условиях демократического общества". С докладом "Основные тенденции изменения законодательной власти после выборов нового Верховного Совета" выступил лидер Объединенной демократической партии Беларуси Александр Добровольский.

Двухдневный семинар включал в себя круглый стол лидеров политических партий, выступления ученых, экспертов и политических деятелей: С.Шушкевича, В.Карбалевича, В.Казначеева, М.Чудакова и др.

Организаторы семинара -- Международный образовательный центр и Фонд Фридриха Эберта.

Нашай дзяржаве жыццёва неабходна паўнапраўная і моцная чацвёртая ўлада!

Заява журналістаў -- удзельнікаў Нацыянальнай асамблеі прагрэсіўных сіл Рэспублікі Беларусь

Мы, журналісты, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі Беларусі, абмеркаваўшы на Нацыянальнай асамблеі прагрэсіўных сіл праблемы і перспектывы дзейнасці друкаванай і электроннай прэсы краіны, канстатуем, што выйсце з крызісу і далейшы прагрэс беларускага грамадства немагчымыя без фарміравання незалежнай, дзеяздольнай, надзейна абароненай дасканалым законам чацвёртай улады -- аднаго з важнейшых атрыбутаў дэмакратычнага ладу жыцця.

На жаль, сёння створаны ўмовы, калі беларуская прэса не ў стане эфектыўна выконваць свае грамадскія функцыі -- усебакова і аб'ектыўна інфармаваць народ, крытычна аналізаваць праблемы краіны, адлюстроўваць увесь сектр грамадскай думкі. На Беларусі не забяспечана дэклараваная Канстытуцыяй свабода слова і друку, у дзяржаўных колах пануе стары, атрыманы ў спадчыну ад таталітарнага рэжыму погляд на прэсу як на паслухмяны рупар кіруючай эліты. Прэзідэнт і яго каманда не выканалі сваіх перадвыбарчых абяцанняў разняволіць сродкі масавай інфармацыі. Наадварот, яны усё больш манапалізуюцца і адчуваюць з боку ўлад усё больш моцны дыктат. У адносінах да дзяржаўнай прэсы фактычна працягваецца практыка цэнзуры, прычым не толькі ўскосна (праз так званую "кадравую палітыку"), націск на кіраўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, рэпрэсіі супраць няўгодных журналістаў ці нават цэлых калектываў, але і ў такіх непрыхаваных, дзікіх формах, якія нагадваюць самыя змрочныя камуністычныя часы. Дастаткова згадаць нядаўнюю скандальную гісторыю з "белымі плямамі". Выкарыстоўваючы сваю манаполію на выдавецкія магутнасці, на сістэму распаўсюджвання прадукцыі мас-медыа, іншыя рычагі ціску, дзяржава заганяе ў кут і фармальна не залежныя ад яе сродкі масавай інфармацыі.

Разам з тым адсутнічае цывілізаваная сістэма дзяржаўнай падтрымкі прэсы, якая ў той ці іншай форме існуе ва ўсіх дэмакратычных краінах і ахоплівае ўсе сродкі масавай інфармацыі незалежна ад іх статусу. Пакінуты на волю лёсу і ціха гінуць многія беларускамоўныя выданні. Прыняты нядаўна пасля доўгіх зацяжак Закон аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі не дае дастатковых гарантый свабоды прэсы, не падмацаваны іншымі заканадаўчымі актамі, ды і практыка дзейнасці нашых улад паказвае, што ў адносінах да мас-медыа яны не надта зважаюць на прававыя нормы.

На жаль, не стаў сапраўдным абаронцам свабоды друку і Саюз журналістаў Беларусі. Рэфармаванне гэтай адарванай ад сапраўдных журналісцкіх праблем структуры падаецца надзвычай праблематычным. Такім чынам, сістэма СМІ Беларусі знаходзіцца ў прыгнечаным і занядбаным стане.

Каб найхутчэй выправіць гэта становішча, якое, акрамя ўсяго іншага, дыскрэдытуе нашу краіну ў вачах міжнароднай супольнасці, мы лічым неабходным наступнае:

-- *распрацаваць цывілізаваную дзяржаўную праграму развіцця нацыянальных сродкаў масавай інфармацыі, якая павінна базіравацца не на чыноўніцкай дзяльбе датацый, а на стварэнні спрыяльных умоў для дзейнасці ўсіх мас-медыа праз палітыку льготнага падаткаабкладання, памяркоўных тарыфаў на друкаванне, распаўсюджванне прадукцыі прэсы і г.д.;*

-- *юрыдычна забяспечыць калектывам манапалізаваных дзяржавай выданняў права і механізм набыцця самастойнага статусу з улікам іх укладу ў стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы рэдакцый;*

-- *заканадаўча забараніць дзяржаўным структурам выступаць у якасці заснавальніка ці сузаснавальніка сродкай масавай інфармацыі, акрамя спецыялізаваных бюлетэняў;*

-- *акцыяніраваць Дзяржтэлерадыё, стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця недзяржаўных нацыянальных тэлестудый і радыёстанцый;*

-- *дэманапалізаваць паліграфічную базу і сістэму распаўсюджвання перыядычных выданняў шляхам раздзяржаўлення Беларускага Дома друку, іншых буйных выдавецтваў, Белсаюздруку, мясцовых друкарняў;*

-- *прадугледзець у заканадаўстве канкрэтныя меры ў дачыненні да асоб, вінаватых у заціску свабоды друку;*

-- *стварыць грамадскі Назіральны савет у галіне СМІ, які выконваў бы ролю трацейскага суддзі ў канфліктных сітуацыях;*

-- *стварыць у мэтах дзейснай абароны правоў і інтарэсаў прадстаўнікоў чацвёртай улады Асацыяцыю журналістаў Беларусі як альтэрнатыву нерэфармуемай структуры Саюза журналістаў, для чаго ў якасці першага кроку выбраць на гэтай асамблеі ініцыятыўны камітэт па стварэнню такой асацыяцыі.*

Гэтыя захады не ставяць на мэце забяспечыць журналістам нейкія асаблівыя прывілеі, вызваліць іх ад юрыдычнай і маральнай адказнасці. Яны патрэбны якраз для таго, каб журналісты маглі дастойна, сумленна выконваць свой абавязак перад беларускім грамадствам.



Вы нас бачыце?

"Пакуль існуюць палітыка і грошы, не трэба хваляваціа і турбаваць сябе рознымі думкамі наконт незалежнасці электронных сродкаў масавай інфармацыі".

(Недарэчныя думкі аўтара)

16 лютага ў памяшканні Нацыянальнага прэс-цэнтру адбылася прэс-канферэнцыя, зладжаная СП "Космас-TV". Журналісты прыйшлі і нават нешта пазначалі ў нататніках, але, як мне падалося, іх прысутнасць не з'яўлялася абавязковай, таму што прэс-канферэнцыя, годна пазначаная ў запрашэнні як "Адкрыццё ў Мінску эфірна-кабельнага тэлебачання і праблемы, якія ўзнікаюць пры яго рэалізацыі", пераўтварылася ў дыялог паміж СП "Космас-TV" і АТ МКТ, галоўнымі пытаннямі якога былі наступныя: АТ МКТ патрабуе дадатковага выдзялення частот, а СП "Космас-TV" просіць даць яму спакойна жыць.

Кароткая гісторыя развіцця падзей.

Кампанія ITI ўжо даўно заснавала шматканальнае кабельнае тэлебачанне ў Маскве, Рызе, Ташкенце, Тбілісі ды іншых гарадах былога СССР, якое вызначаецца, як паведамілі, высокай якасцю. Узнікла ідэя стварыць такі тэлевізійны рай і для жыхароў Мінска, дзеля чаго і было створана СП "Космас-TV", у якое ўвайшлі ITI, АТ "Тэхнасат", "Мінсктэхніка" і, зразумела, РТПЦ (рэспубліканскі тэлевізійна-перадаючы цэнтр), таму што толькі ён -- РТПЦ -- і мае права вяшчання (маецца на ўвазе тэхналагічны працэс вяшчання, а не праграмнае яго забеспячэнне). РТПЦ належыць 17% СП "Космас-TV" і ён старанна абараняе гэты праект. Прадпрыемства зарэгістравана, неабходнае абсталяванне ёсць і ляжыць у гуртоўні, а калі пачне працаваць -- невядома. Таму што гэтым часам у Мінску было створана АТ МКТ (Мінскае кабельнае тэлебачанне), якое таксама зацікаўлена ў атрыманні як мага большай колькасці каналаў вяшчання і ў кола сяброў якога, акрамя усіх іншых, уваходзяць Мінскія тэлевізійныя інфармацыйныя сеткі пры гарвыканкоме (таксама дзяржаўная структура, але рангам ніжэй). АТ МКТ арэндуе кабельныя лініі Мінска, але вельмі незадаволена іх колькасцю і не жадае разумець, чаму СП "Космас-TV" атрымлівае болей.

У барацьбе за кабельнае тэлевяшчанне, як паведамілі на прэс-канферэнцыі, абодва бакі выкарыстоўвалі розныя сродкі: прапановы, падтасоўкі, перамовы, заявы пра абрабаванне простых жыхароў Мінска, абвяржэнні, выступленні адказных асобаў з тлумачэннем тэхнічнай немагчымасці павелічэння колькасці каналаў, каб усе атрымалі аднолькава, і нарэшце --прэс-канферэнцыя з фуршэтам (накарміць галодных журналістаў, каб добра пісалі... "за поспех нашага безнадзейнага прадпрыемства").

А тым часам гульня працягваецца. СП "Космас-TV" пакуль разлічвае на 16 каналаў, АТ МКТ -- на 8 і з гэтым, зразумела, нязгодна. Усе сведкі канфлікту чакаюць, што ж зараз зробіць АТ МКТ. Рэспубліканскі тэлевізійна-перадаючы цэнтр моцна трымае рукамі дзяржавы ўсе кабелі і частоты, а жыхары Мінска занепакоена бегаюць па кватэрах з антэнамі ў руках, каб злавіць хаця б што-небудзь на гэтым тэлевізійным экране.

І.КУРАПАТКІНА, для "БМ"

МАЛАШКА ВЕДАЕ, ЯК ЗРАБІЦЬ НАС ЗАМОЖНЫМІ

На фоне нашага сённяшняга жыцця неяк пабляклі вострасюжэтныя дэтэктывы. Што тыя кніжныя страсці, калі ўсе мы апынуліся ў самым віры жахлівага дэтэктыва ў якасці ахвяры, якую падманваюць, абкрадаюць, рабуюць і, у рэшце рэшт, забіваюць. Хаця (дзякуй і за тое) павольна, а гэта дае шанц на выратаванне. Калі ахвяра, вядома, таго захоча.

Дык у які ж бок кінуцца, шукаючы паратунку? Адзін раз ужо, здаецца, рванулі ўслед за "лепшай большасцю". Аказалася, не туды.

Хоць былі і іншыя шляхі. Ёсць яны і зараз. Адзін з іх прадстаўляе фракцыя Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады Вярхоўнага Савета, якая распрацавала эканамічную праграму і даказала на лічбах, як гэта можа быць рэалізавана праз альтэрнатыўны бюджэт.

Адзін з аўтараў праграмы -- **Віталь Малашка**. Размова з ім захапіла мяне, неспецыяліста ў эканоміцы, больш за любы дэтэктыўны сюжэт. Гэта і не дзіўна -- гаварылі мы пра грошы. Нашы грошы. Сумленна зробленыя і невядома куды знікаючыя. Па ходу размовы спадар Малашка даў некалькі міні-урокаў эканомікі.

Урок 1. *У сваёй эканамічнай праграме фракцыя БСДГ даказала, што можна знізіць падаткі да 30%. Што гэта дае? Павелічэнне зарплаты ў 3 разы (да 70-80 даляраў). Адбываецца гэта так. Напрыклад, прадукцыя каштуе 1 р., дык заробак з гэтай прадукцыі будзе 5 кап., бо 50% пойдзе на рэсурсы, а 45% -- на падаткі. Дык вось падатак можна паменшыць да 30%, а заробак павялічыць да 15 кап. Гэта -- павышэнне пакупніцкай здольнасці насельніцтва, ажыўленне прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Але для таго, каб гэта ажыццявіць, патрэбны 4 трыльёны рублёў. І на пытанне "дзе іх узяць?" ёсць просты адказ -- выкарыстаць геаграфічнае становішча Беларусі.*

Па 200 мільёнаў можна зарабіць на транзіце энерганосьбітаў і грузаў па чыгунцы, 20 мільёнаў -- на транзіце грамадзян, а таксама трэба браць грошы з Расіі за арэнду ваенных баз на нашай тэрыторыі.

-- А як жа наконт сяброўства с рускім народам?

-- Сяброўства з рускім народам тут ні пры чым. Тут дзейнічаюць эканамічныя законы. расійскія манаполіі імкнуцца атрымаць прыбытак за наш кошт. А сяброўства -- гэта палітычны козыр. На чале гэтых манаполіяў можа стаяць хто заўгодна, можа нават і беларус. Ідэалогія ўсё яшчэ сварыцца з эканомікай.

-- Наколькі аптымістычна вы глядзіце на ажыццяўленне гэтага праекта?

-- Доля аптымізму вельмі сціплая, але пры пэўнай большасці ў будучым Вярхоўным Савеце небесперспектыўная.

-- І таму вы збіраецеся балатавацца ў парламент другі раз?

-- Гэта дасць магчымасць давесці да канца справы, якія нам ужо ўдалося раскруціць. А сёе-тое нам сапраўды удалося. Успомніце 1992 год. Масква загадала: ідзём да рынку. На самой справе гэта азначала наменклатурную прыватызацыю. Мы ўшчынілі лямант, каб палова дзяржаўнай маёмасці была раздадзена народу бясплатна. Гэта рэалізуецца зараз праз чэкі "Маёмасць". І такая прыватызацыя спынілася, бо стала невыгодная таму, хто збіраўся пагрэць на гэтым рукі. Такім чынам атрымалася, што мы не далі ўсё разбазарыць, але ў той жа час прадпрыемствы засталіся дзяржаўнымі.

-- Але якая карысць ад гэтых чэкаў "Маёмасць" асабіста мне? Нешта не верыцца ні ў якія дывідэнды...

-- Атрыманне дывідэндаў і не з'яўляецца асноўнай функцыяй акцыі для пакупніка.

Урок 2. *У "правільным" грамадстве, калі чалавек мае грошы, ён можа ўкласці іх у банк і атрымліваць працэнты, а можа купіць акцыю і атрымліваць дывідэнды. І дывідэнды звычайна ніжэйшыя за працэнт у банку. Таму што прадпрыемства, якое прадае акцыі, імкнецца нарошчваць сваю вытворчасць, а не забяспечваць высокія дывідэнды. А калі вытворчасць расце, дык і кошт акцыі павышаецца. І праз 10-20 гадоў акцыю можна прадаць за такую суму, якая забяспечыць, скажам, бязбедную старасць.*

-- Засталіся і яшчэ не даведзеныя да ладу справы. Мы пралічылі, якім чынам можна кампенсаваць страчаныя насельніцтвам уклады. Яшчэ адна справа -- гэта іскі грамадзян супраць дзяржавы. Чаму дзяржава праз пракурора можа прад'явіць іск да асобы (напрыклад, у выпадку дэзерцірства), а грамадзяне не маюць магчымасці судзіцца з дзяржавай?

-- Ці галасавалі вы за прывілеі дэпутатам?

-- Асабіста я не галасаваў. Але згодны з тым, што дэпутат павінны быць дастаткова забяспечаны, каб не купляўся так лёгка, як гэта было зроблена з многімі дэпутатамі пры ўладзе Кебіча. Машына, жыллё -- гэтага часта было дастаткова. Дэпутат павінны быць забяспечаны службовым жыллём, якое павінна належаць акрузе. Змяніўся дэпутат -- змяніўся гаспадар кватэры. Дэпутат павінны быць упэўнены, што праз 5 гадоў ён не апынецца на вуліцы, бо з папярэдняга месца працы ён звольнены. Увогуле, дэпутат прайграе ў прывілеях пракурору, вайскоўцу, міліцыянту.

-- А якія жыллёвыя ўмовы ў вас?

-- Стаю на чарзе з 1982 года.

-- У размове вы аперыравалі такімі лічбамі, як трыльён, мільён... А які асабіста ваш "бюджэт"?

-- Дэпутацкая зарплата (каля 30 даляраў) нармальнага харчавання не забяспечвае. Агарод у вёсцы і ўсё, як у людзей. Адзінае, калі пасля сканчэння дэпутацкіх паўнамоцтваў не працаўладкуюся, дык на працягу года буду атрымліваць зарплату. Але работа ў Камісіі па эканамічнай рэформе дала дастатковы вопыт, каб знайсці працу ў добрай фірме.

-- Тым не менш вы гатовы пайсці ў Вярхоўны Савет на другі круг.

-- Бо я бачу перспектыву. Напачатку я апынуўся ў меншасці (апазіцыя складала каля 30 чалавек). І ў той час, калі дэпутаты купляліся вельмі лёгка, я адстойваў сваю пазіцыю не праз страўнік. Гэта давала свабоду дзеянняў. Удалося праламаць сцяну ў многіх пытаннях. Хацелася б давесці да ладу пачатае.

А што ж мы? Мы так і будзем стаяць з пятаком заробку ў жабрачай далоні ды назіраць, як над намі вялізнымі дзікімі чародамі пралятаюць нашыя грошы -- з усходу на захад, з захаду на ўсход? Але гэта пытанне ўжо не да Віталя Малашкі. Наперадзе выбары, і калі не выберам мы, дык выберуць за нас.

Гутарыла
Надзея КАСЦЮКЕВІЧ, "БМ"

Политологи политизируются

Еще пару лет назад молодежь Беларуси небезосновательно считалась апатичной. С разрушением административно-командной системы с ее каналами мобилизации молодежи в большую политику через первичные структуры ВЛКСМ новое поколение просто лишилось механизма вступления в политическую жизнь.

Сегодня уже есть изменения в этой области, произошло становление национально ориентированных молодежных сил (ЗБМ), которые обладают значительным организационным и содержательным потенциалом. Пересмотрели свои позиции бывшие члены ВЛКСМ (СМБ), которые благодаря опыту, имеющейся материальной базе и поддержке государственных структур держат свою нишу в политической сфере.

Еще год назад студент Алесь Михалевич, идейный вдохновитель создания Республиканской ассоциации студентов-политологов подчеркивал парадоксальность ситуации, сложившейся среди студентов отделения политологии БГУ: "политическая профессия" и аполитичность ее будущих обладателей. Тогда Алесь был единственным среди нас, кто начал заниматься преодолением парадокса всерьез. Группа подсмеивалась, а теперь оценили и зауважали. Теперь для становления студентов-политологов и всех, кто в будущем хочет заниматься таким сложным, неоднозначным делом, как политика, создается РАСП. По каналам международных контактов члены РАСП были приглашены на I Европейскую политическую конференцию.

Конференция была организована Клубом политических студентов Варшавского университета и Фундацией поддержки инициатив европейских PRO-EUROPA. Ее целью было политологическое образование молодых людей по спорным вопросам современности, донесение опыта, выработанного в ЕС, формирование мнения о характере вступления Польши в этот союз.

О размахе акции можно судить по цифрам: в течение 12 дней около 55 молодых людей, в том числе 3 из БГУ слушали лекции, дискуссировали, играли в деловые игры, находясь на студенческой базе в приграничном городе Чешине. Организатором это обошлось в 11 тыс.долларов. Поддержку оказали европейские фонды.

Все участники конференции -- члены товариществ "Молодые демократы", теснейшим образом связанные с организаторами мероприятия и координирующие с ними свою деятельность. Они объединены в молодежном европейском клубе, создание филиала которого на территории Беларуси было одним из результатов нашей поездки.

Елена АКУЛЕВИЧ, студентка отделения политологии

ТВ -- программа на неделю

Понедельник, 27 февраля

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль. 7.50 Студия "Политика". Детский сеанс 8.05 Волшебный экран. Мультфильмы. 8.40 "Как я был вундеркиндом". Спектакль. 10.20 Творческое об"единение "Мой мир". Как рождается музыка? Юный композитор Динара Мазитова. * * * 10.30 Рок-коронование-94. 12.00 "Черный аист". Худ.фильм. 13.35 История Беларуси. Белорусское национальное освободитель-ное движение в 1905 - 1907 гг. * * * 15.40 Музыкальные памятники. Страницы "Полоцкой тетради". 16.00 Поэзии строка волшебная. Е.Янищиц. 16.05 Творческое об"единение "Мой мир". За колыбельной к бабушке. 16.20 "Первая белорусская..." К выходу первой исторической энциклопедии. 16.40 Студия "Культура". 17.10 Истоки. Уроки белорусского языка. 17.30 Проспект. Информационно-аналитическакя программа. 18.00 Новости (с сурдопереводом). 18.10 На добрый лад. Телеочерк. 18.20 "Возвращение национальных сокровищ". По материалам Международной конференции в Нью-Йорке. Рассказывает Адам Мальдис. 19.00 Международные новости (Би-би-си). 19.20 Студия "Край". "Колесо времени". 19.50 Музыка без границ. Композитор Сергей Кортес. 20.15 День столетия. 20.20 Зеркало Си-эн-эн. 20.35 Колыбельная. 21.00 Новости. 21.40 Студия "Политика". 21.55 Клип-концерт. Ядвига Поплавская и Александр Тихонович. 22.05 Спортивный телекурьер. 22.25 "Телевизионный АРТ-клуб". Бенефис народного артиста СССР Ростислава Янковского. 23.45 Новости. 0.05 Молодое кино Беларуси. Мастерская кинорежиссера Виктора Турова. 0.25 Под куполом Вселенной.

Канал "Останкино"

5.30 Утро. 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Новости. 8.00 "Необыкновенная схватка". Мультсериал. 8.25 "Дикая Роза". Телесериал. 9.00 Человек и закон. 9.30 Мал золотник, да дорог. 14.00 Под знаком Меркурия. 14.20 Фондовый рынок. 14.30 Хроника деловой жизни. 14.40 Телемикс. 15.00 Звездный час. 15.40 Наше завтра. 16.20 "Элен и ребята". Молодежный сериал. 16.50 Мир сегодня. 17.00 У всех на устах. 17.30 В эти дни 50 лет назад. 17.45, 20.30 Погода. 18.00 Час пик. 18.30 "Дикая Роза". Телесериал. 19.00 Кто вы? 19.40 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время. 20.40 Встреча с А.И.Солженицыным. 21.00 Гол. 21.30 Золотой шлягер. Полад Бюль-Бюль Оглы. 22.30 Пресс-клуб. 23.50 Пресс-экспресс.

Канал "Россия"

6.00, 7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 6.05 Ритмика. 6.20 Звезды говорят. 6.25 Река времени. 6.30 Формула 730. 7.25 Телегазета. 7.30 Время деловых людей. 8.00 Всемирные новости Эй-би-си. 8.25 Депеша. 8.55 Музыкальный экспромт. 9.10 Кинофестиваль "День Победы". "Вызываем огонь на себя". Худ.фильм. 2-я серия. 10.25 Торговый дом. "Дженсер-клуб". 10.40 Крестьянский вопрос. 11.05, 13.20 Деловая Россия. 14.10 Шедевры из провинции. 15.05 Там-там новости. 15.20 Праздник каждый день. 15.30 Мульти-пульти. 16.05 Новая линия. 16.45 "В этот день..." 16.50 Сказки для родителей. 17.20 Репортажи с мест. 17.30 Спасение 911. 18.25 Устами младенца. 19.25 Подробности. 19.35 "Убийство на балу в честь дня победы". Худ.фильм. 20.40 Репортер. 21.00 Без ретуши. 22.30 Река времени. 22.40 Автомиг. 22.45 Экран криминальных сообщений. 22.55 "Гонка за жизнью". Худ.фильм (Италия). 2-я серия. 23.45 Тишина N 9.

Санкт-Петербург

16.50 Зебра. 17.35 Мультфильм. 17.50 Музыкальный момент. 17.55 Крестики-нолики. 18.30, 21.30 Информ ТВ. 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Большой фестиваль. 19.25 "Мануэла". Худ. фильм. 20.10 "Незнакомая песня". Худ.фильм. 20.40 "Остров невезения". Телеигра. 21.10 Телемагазин. 21.15 Телеслужба безопасности. 21.45 Спортивные новости. 22.05 "Ловушка". Премьера худ.фильма (Италия). 1-я серия.

Вторник, 28 февраля

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль. 7.50 "Эта надоедливая оса". Научно-популярный фильм. 8.25 Зеркало Си-эн-эн. 8.40 Студия "Политика". 8.55 День столетия. 9.00 История Беларуси. Белорусское национальное освободительное движение в 1905 - 1907 гг. Детский сеанс 9.30 Золотой фонд. "Экзамен на осень". Телеспектакль. 11.20 Мультфильмы. 12.00 Творческое об"единение "Мой мир". "Горе от ума" в Альтернативном. 12.30 Музыкальный салон. Приглашает Элеонора Езерская. 13.10 "Белвидеоцентр приглашает". "Припять в лето 1994 года". Док.фильм. 14.15 Изучаем свою историю. "Максим Горецкий. Аллея жизни". Док.фильм Белорусского телевидения. 14.45 "Голоса прошлого". Открытие фестиваля памяти композитора М.К.Огинского. 15.35 Белорусская литература. Янка Купала. "Павлинка". 16.05 "Мансарда". Зимняя графика. 16.35 "23 40" на восток от Гринвича". 17.05 Советы огородникам. 17.30 Уроки Н.Новожиловой. 18.00 Новости (с сурдопереводом). 18.10 Чернобыль: проблемы и решения. Прямая линия. 19.00 Международные новости (Би-би-си). 19.20 Мост. 19.45 "Лада ОМС" представляет: "Моя любовь, моя печаль". Теле-сериал. 20.15 Зеркало Си-эн-эн. 20.30 Студия "Эксклюзив". "И это жизнь?!.." 20.35 Колыбельная. 21.00 Новости. 21.40 Студия "Политика". 21.55 Клип-концерт. Алена Апина. 22.05 "Перемените обстановку". Трехсерийный худ.фильм (Италия). 1-я серия. 23.05 Экономикст. 23.15 Новости. 23.35 Под куполом Вселенной. 23.45 Международный турнир по фехтованию памяти Германа Бокуна.

Канал "Останкино"

5.30 Утро. 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Новости. 8.00 "Необыкновенная схватка". Мультсериал. 8.25 "Дикая Роза". Телесериал. 9.00 Ты помнишь, товарищ... 9.30 "Когда-то русская Америка". Программа Тюменской студии телевидения. 14.00 Дверь в малый бизнес. 14.20 Дело и право. 14.30 Хроника деловой жизни. 14.40 Культура и бизнес. 15.00 Домисолька. 15.30 Волшебный мир, или Синема. 16.00 Джем. 16.20 "Элен и ребята". Молодежный сериал. 16.50 Мир сегодня. 17.00 Русский мир. 17.30 Загадка СБ. 17.40, 20.30 Погода. 17.45 Кто есть кто. XX век. Ю.Власов. 18.00 Час пик. 18.30 "Дикая Роза". Телесериал. 18.55 Мы. Авторская программа В.Познера. 19.40 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время. 20.40 Из первых рук. 20.50 Э.Радзинский. Загадки истории. "Провокаторы в России". Часть 1-я. 21.40 "Терминатор-2". Худ. фильм (США). 0.20 Пресс-экспресс.

Канал "Россия"

6.00, 7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 6.05 Ритмика. 6.20 Звезды говорят. 6.25 Река времени. 6.30 Формула 730. 7.25 Телегазета. 7.30 Время деловых людей. 8.00 Всемирные новости Эй-би-си. 10.25 Торговый дом. 10.40 Крестьянский вопрос. 11.05, 13.20 Деловая Россия. 13.45 "Приключение с дешевой квартирой". Худ.фильм. 15.05 Там-там новости. 15.20 Праздник каждый день. 15.30 "Пиратский остров". Худ.фильм. 3-я серия. 16.05 Новая линия. 16.45 "В этот день..." 16.50 Бесшумные лидеры. 17.20 Никто не забыт. 17.25 Театральный раз"езд. "У Петрушки". 18.10 L-клуб. 19.25 Подробности. 19.40 "Солнце неспящих". Худ.фильм. 22.30 Река времени. 22.40 Автомиг. 22.45 Экран криминальных сообщений. 22.55 "Гонка за жизнью". Худ.фильм. 3-я серия. 23.45 Парижские премьеры.

Санкт-Петербург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Информ ТВ. 12.10 Мультфильм. 12.30, 14.45, 17.55 Музыкальный момент. 12.35 "Немецкая волна". 13.00 Скорая помощь. 13.30 "Мануэла". Худ. фильм. 14.15 "Семикаракорский фаянс". Телефильм. 14.50 "Опиум". Худ.фильм. 16.10 Мультфильм. 16.25 Волшебная линия. 16.40 "Там, где живет Паутиныч". 16.55 Мультфильм. 17.05 "Пусть цветет иван-чай". Телеспектакль. Часть 1-я. 18.00 По всей России. 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Большой фестиваль. 19.25 "Мануэла". Худ. фильм. 20.15 "Евгений Онегин". 1-я глава. Исполняет С.Юрский. 20.55 Ретроспективный экран. "Драма в цирюльне". Худ.фильм. 21.10 Телемагазин. 21.15 Телеслужба безопасности. 21.45 Спортивные новости. 22.05 "Ловушка". Премьера худ.фильма (Италия). 2-я серия. 23.45 Хоккей. Кубок МХЛ. СКА(Санкт-Петербург) - "Кристалл" (Электросталь). 3-й период.

Среда, 1 марта

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль. 7.50 Экономикст. 8.00 Студия "Политика". 8.15 Зеркало Си-эн-эн. 8.30 "Лада ОМС" представляет: "Моя любовь, моя печаль". Телесериал. 9.00 Белорусская литература. Янка Купала. "Павлинка". 9.30 Волшебный экран. Мультфильм. 10.05 К 50-летию Победы. "Живи и помни". Ретроспективный показ фильмов киностудии "Беларусьфильм": "Долгие версты вой-ны". Худ.фильм. 1-я серия. 11.30 "Золотая лира". Телефестиваль белорусской песни. Часть 1-я. 12.50 Бон тон. 13.10 Видимо-невидимо. Новости кино-видео-аудио. 15.45 Изучаем свою историю. "Из чего сорока кашу варила". Док. фильм Белорусского телевидения. 16.15 Творческое об"единение "Мой мир". Личность. 16.30 "Все мы родом из детства". Торжественное открытие П Все-белорусского телефестиваля юных талантов. 18.00 Новости (с сурдопереводом). 18.10 "Крок". "Пять звезд". Телеигра. 19.00 Международные новости (Би-би-си). 19.20 Студия "Политика". Телевизионная пресс-конференция министра сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь В.С.Леонова. 20.20 Зеркало Си-эн-эн. 20.35 Колыбельная. 21.00 Новости. 21.40 Студия "Политика". 21.55 Клип-концерт. Лада Дэнс. 22.05 "Перемените обстановку". Худ.фильм. 2-я серия. 23.05 Шоу-прогноз. 23.10 Новости. 23.30 Под куполом Вселенной. 23.40 Столица. Тележурнал.

Канал "Останкино"

5.30 Утро. 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50, 1.00 Новости. 8.00 "Необыкновенная схватка". Мультсериал. 8.25 "Дикая Роза". Телесериал. 9.00 Клуб путешественников (с сурдопереводом). 14.00 Производство: крупный план. 14.10 Деньги и счастье. 14.20 Хроника деловой жизни. 14.30 Агентство "Шанс". 14.40 Каждый раз на этом месте. 15.00 Посмотри, послушай. 15.20 "Путешествие в прошлое". Мультфильм (США). 16.00 Тин-тоник. 16.20 "Элен и ребята". Молодежный сериал. 16.50 Мир сегодня. 17.00 Межгосударственная телерадиокомпания "Мир". 17.40, 20.30 Погода. 17.45 Кто есть кто. XX век. С.Бандера. 18.00 Час пик. 18.30 "Дикая Роза". Телесериал. 19.00 Сельский час с Ю.Черниченко. 19.40 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время. 20.40 Монолог. 20.50 Э.Радзинский. Загадки истории. "Провокаторы в России". Часть 2-я. 21.35 Человек и закон. 21.50 Футбол. Лига чемпионов. 1/4 финала. "Барселона" (Испания) - "Пари Сен-Жермен" (Франция). 23.50 Пресс-экспресс. 24.00 Футбол. Лига чемпионов. 1/4 финала. Обзор трех матчей.

Канал "Россия"

6.00, 7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 6.05 Ритмика. 6.20 Звезды говорят. 6.25 Река времени. 6.30 Формула 730. 7.25 Телегазета. 7.30 Время деловых людей. 8.00 Всемирные новости Эй-би-си. 8.25 Ключевой момент. 8.35 Театральный раз"езд. "Иванов и другие". 9.20 Музыкальный экспромт. 9.30 Без ретуши. 10.25 Торговый дом. 10.40 Крестьянский вопрос. 11.05, 13.20 Деловая Россия. 14.10 "Человек и океан". Док.фильм. 15.05 Там-там новости. 15.20 Праздник каждый день. 15.30 Студия "Рост". 16.05 Дальний Восток. 16.45 "В этот день..." 16.50 Золотая ветвь. Художник Ольга Флоренская. 17.20 Моя война. 17.45 Теледебаты. 18.15 Никто не забыт. 18.20 Своя игра. 19.25 Подробности. 19.35 "Санта-Барбара". Худ.фильм. 20.30 Астрология любви. 21.05 XX век в кадре и за кадром. "Мейерхольд: неразгаданная загадка". 22.30 Река времени. 22.40 Автомиг. 22.45 Рандеву. 22.55 "Мейерхольд: неразгаданная загадка". Продолжение программы.

Санкт-Петербург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Информ ТВ. 12.10 Мультфильм. 12.30, 14.45, 16.00 Музыкальный момент. 12.35 "Немецкая волна". 13.00 Скорая помощь. 13.30 "Мануэла". Худ. фильм. 14.15 "Львовские этюды". Телефильм. 14.50 "Мужская компания". Худ.фильм. 16.05 Волшебная линия. 16.25 "Пусть цветет иван-чай". Телеспектакль. Часть 2-я. 17.05 Мультфильм. 17.10 Жизнь с комфортом. 17.25 Мультфильм. 17.45 По всей России. 17.55 Исторический альманах. 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Большой фестиваль. 19.30 "Мануэла". Худ.фильм. 20.15 "Билет в Москву". Музыкальный фильм. 20.35 Блеф-клуб. 21.10 Телемагазин. 21.15 Телеслужба безопасности. 21.45 Спортивные новости. 22.05 Авторалли. Чемпионат России "Луга-95". 22.35 "Замок Помпон Руж". Худ.фильм. 5-я серия. 23.00 "Театральные истории". Худ.фильм.

Четверг, 2 марта

Белорусское телевидение

7.35 Утренний коктейль. 7.50 "Голоса природы", "Планета не только людей". Док.фильмы. 8.30 Зеркало Си-эн-эн. 8.45 Студия "Политика". 9.00 "Крок". "Пять звезд". Телеигра. 9.50 "Танго, танго". Фильм-концерт. 10.20 "Нежность". Киноочерк. 10.35 Уроки Н.Новожиловой. Детский сеанс 11.05 "Мансарда". Зимняя графика. 11.35 Мультфильмы. 12.20 Творческое об"единение "Мой мир". Личность. 12.35 "Долгие версты войны". Худ.фильм. 2-я серия. 13.45 Мир и человек. Философские диалоги. 14.15 Многозвучие. 14.45 С музыкой на "Вы". Прощание по Гайдну. 16.30 История Беларуси. Рассказ о жизни людей на древнебело-русских землях. 17.00 "Во имя и на благо". Док.фильм Белорусского телевидения. 17.30 Родовод. "Что ни край, то свой обычай". 18.00 Новости (с сурдопереводом). 18.10 "Мелодия хлеба". Предлагают ученые Австрии. 18.30 "Праздник". Телеочерк. 19.00 Международные новости (Би-би-си). 19.20 "Крок". "Своевременно". 19.50 "Лада ОМС" представляет: "Моя любовь, моя печаль". Телесериал. 20.20 Зеркало Си-эн-эн. 20.35 День столетия. 20.40 Колыбельная. 21.00 Новости. 21.40 Студия "Политика". 21.55 Студия "Эксклюзив". "Весы". 22.00 Клип-концерт. Группа "ДДТ". 22.15 "Перемените обстановку". Худ.фильм. 3-я серия. 23.15 Экономикст. 23.25 Новости. 23.45 "Крок". "Живая земля". Экологическая программа. 0.05 Под куполом Вселенной.

Канал "Останкино"

5.30 Утро. 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Новости. 8.00 "Необыкновенная схватка". Мультсериал. 8.25 "Дикая Роза". Телесериал. 9.00 В мире животных (с сурдопереводом). 9.40 Экслибрис. 14.00 Село и реформы. 14.20 Мой маленький бизнес. 14.30 Хроника деловой жизни. 14.40 Разрешите представиться. 15.00 Мультитроллия. 15.20 На балу у Золушки. 16.00 Компьютер-холл. 16.20 "Элен и ребята". Молодежный сериал. 16.50 Мир сегодня. 17.00 ... До 16 и старше. 17.30 Миниатюра. 17.40, 20.30 Погода. 17.45 Кто есть кто. XX век. Джон Френч. 18.00 Час пик. 18.30 "Дикая Роза". Телесериал. 19.00 Ван Дамм, Ван Дамм... Авторская программа В.Молчанова. 19.40 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время. 20.40 Москва. Кремль. 21.00 Лотто "Миллион". 21.30 "Млечний путь". Худ. фильм (Франция). 23.35 Авто-шоу. 23.50 Пресс-экспресс.

Канал "Россия"

6.00, 7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 6.05 Ритмика. 6.20 Звезды говорят. 6.25 Река времени. 6.30 Формула 730. 7.25 Телегазета. 7.30 Время деловых людей. 8.00 Всемирные новости Эй-би-си. 8.25 Ключевой момент. 8.35 Музыкальный экспромт. 8.45 "Санта-Барбара". Худ.фильм. 10.25 Торговый дом. 10.40 Крестьянский вопрос. 11.05, 13.20 Деловая Россия. 13.45 "Трагедия в поместье Марздои". Худ.фильм. 15.05 Там-там новости. 15.20 Праздник каждый день. 15.30 Студия "Рост". 16.05 Новая линия. 16.45 "В этот день..." 16.50 Непознанная Вселенная. 17.20 Репортажи с мест. 17.30 Карьера. 18.00 Никто не забыт. 18.05 Непопулярная тема. 18.20 В мире авто- и мотоспорта. 19.25 Подробности. 19.35 "Санта-Барбара". Худ.фильм. 20.30 Городок. Развлекательная программа. 21.00 60 минут. 22.30 Река времени. 22.40 Автомиг. 22.45 Рандеву. 22.55 Антреприза. "Сергей Виноградов - актер, режиссер, коллекционер". 23.40 Вход по пригласительным.

Санкт-Петербург

11.40 "Гость". 14.55 "Баллада о солдате". Худ.фильм. 16.25 Волшебная линия. 16.40 "Три колеса, фолиант и..." 17.00 Мультфильм. 17.10 "Человек-невидимка". Телеспектакль. Часть 1-я. 18.00 Мы и банк. 18.30, 21.30 Информ ТВ. 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Большой фестиваль. 19.30 Ура! Комедия. "Менялы". Худ.фильм. 21.00 "Место действия "Ревизора". Телефильм. 21.10 Телемагазин. 21.15 Телеслужба безопасности. 21.45 Спортивные новости. 22.05 "Телекомпакт". Музыкальное шоу. 23.05 "Вектанца". Телефильм. 5-я часть.

Пятница, 3 марта

Белорусское телевидение

